**УДК 811.161.2. 81'282**

**Я.І. Самуйлик,**
викладач
(Брестський державний університет)

# ГАВОРКІ ВЫГАНАЎСКАГА ПАЛЕССЯ Ў МІЖДЫЯЛЕКТНЫМ АСЯРОДДЗІ

*У статті розглядається проблема діалектної межі між загородськими та понеманськими групами говірок на основі фонетичних та морфологічних особливостей.*

Сучасная дыялектная мяжа паміж заходнепалескай (брэсцка-пінскай, загародскай) і гродзенска-баранавіцкай (панямонскай) групамі гаворак блізкая да старажытнай балта-славянскай моўна-этнічнай мяжы. Многія даследчыкі ўмоўна праводзяць яе па рацэ Ясельдзе. Мяжа гэта невыразная. Тут праходзіць значная колькасць ізаглос [1] . На тэрыторыі адзначанай мяжы ў шырокім плане знаходзіцца даволі спецыфічны рэгіён – Выганаўскае Палессе.

Размешчана Выганаўскае Палессе ў міжрэччы Ясельды (прыток Прыпяці) і Шчары (прыток Нёмана). Найбольш пашыраныя тут паўночнабрэсцкія гаворкі [2]. Адна з груп гэтых гаворак – цэнтральнацеляханская. На поўдзень ад яе пашыраны гаворкі паўднёвацеляханскія. На крайнім поўдні рэгіёна бытуюць гаворкі валішчанска-аброўскія, паўночназагародскія і сярэднезагародскія.

Фарміраванне дыялектнага ландшафту Выганаўскага Палесся мае сувязь не толькі з прыроднымі аб'ектамі або гістарычнымі фактарамі, якія спрыялі кантактам насельніцтва (старадаўні шлях Пінск – Слонім, Агінскі канал) ці перашкаджалі ім (балотныя і лясныя масівы). Відавочна, у даследуемым рэгіёне не было поўнай дыялектнай аднароднасці і ў старажытныя часы, калі пачаў фарміравацца яго дыялектны ландшафт.

Да X—XIII стст. адносіцца значная колькасць славянскіх курганаў у Выганаўскім Палессі. Размешчаны яны ў заходняй яго частцы (Жытлін, Коратчын, Хадакі, Сярадава), цэнтральнай (Святая Воля), паўночна-ўсходняй (Залужжа, Свяціца), паўднёва-ўсходняй (Бакінічы). Прыкладна да VI—XIII стст. адносіцца гарадзішча ў Целяханах.

У XV – пачатку XVI стст. Выганаўскае Палессе ўваходзіла ў склад наступных адміністрацыйных і ўдзельных адзінак [3]. Асноўная адзінка – Вядская воласць (вядома з 1433 г.). Яна ўключала цэнтр і захад былога Целяханскага раёна. Да 1508 г. Вядская воласць уваходзіла ў склад Слонімскага павета. У гэтым жа годзе ўвайшла ў склад Пінскага княства, якое з 1521 г. стала паветам (спачатку Трокскага, а з 1566 г. Берасцейскага ваяводства). Ліпская воласць уключала ўсход былога Целяханскага раёна і прылягаючую частку Ганцавіцкага раёна (Раздзялавічы). Бобрыцкая воласць уключала паўночны ўсход Пінскага, поўдзень Ганцавіцкага раёнаў, большую частку Лунінецкага (без поўначы), часткі Жыткавіцкага і Петрыкаўскага раёнаў. Здзітаўская воласць Слонімскага павета (затым асобны павет) уключала значную частку Драгічынскага і Іванаўскага раёнаў, паўднёвы ўсход Бярозаўскага раёна і тэрыторыю на поўнач амаль да Івацэвіч.

У XVI—XVII стст. Беларусь пакрылася сеткай мястэчак. Гэта паселішчы, якія сумяшчалі ў сабе рысы горада і вёскі. Яны з'яўляліся эканамічнымі цэнтрамі навакольных акруг. У Выганаўскім Палессі і яго наваколлях такімі мястэчкамі з'яўляліся Выганашчы (упамінаецца ў 1600 г.), Хатынічы (з 1661 г.), Івацэвічы (упамінаецца ў 1600 г.), Лагішын (да 1569 г.). Пазней найбольш значным мястэчкам вывучаемага раёна, яго "сталіцай" сталі Целяханы. (першае ўпамінанне адносіцца да XVI ст.).

У пачатку XIV ст. амаль уся тэрыторыя Выганаўскага Палесся ўвайшла ў склад Вялікага княства Літоўскага. У выніку змен адміністрацыйнага падзелу сярэдзіны XVI ст. большая частка разглядаемага рэгіёна апынулася ў складзе Пінскага павета Берасцейскага ваяводства. Пасля другога падзелу Рэчы Паспалітай у склад Расіі ўвайшлі ўсходнія ўскраіны Выганаўскага Палесся, у выніку трэцяга падзелу (1795 г.) – астатняя яго частка. Большая частка рэгіёна ўвайшла ў склад Пінскага павета Мінскай губерні, заходнія ўскраіны – у склад Слонімскага павета (у 1795—1797 гг. у складзе Слонімскай, у 1797—1801 гг. – Літоўскай, з 1801 г. – Гродзенскай губерні). У 1921—1939 гг. Выганаўскае Палессе ўваходзіла ў склад Польшчы. Адміністрацыйна яно з'яўлялася часткай Палескага (Брэсцкага) ваяводства, уваходзячы пераважна ў склад Косаўскага павета. З 1939 г. гэты рэгіён у складзе БССР (Целяханскі, часткова Лагішынскі і Ганцавіцкі раёны Пінскай вобласці, ускраіны – у складзе Косаўскага раёна Брэсцкай і Ляхавіцкага раёна Баранавіцкай абласцей). У 1954 г. Пінская вобласць і чатыры раёны Баранавіцкай (у тым ліку Ляхавіцкі) уключаны ў склад Брэсцкай вобласці. Косаўскі раён у 1947 г. у выніку пераносу раённага цэнтра ў Івацэвічы перайменаваны ў Івацэвіцкі. Апошні ў1962 г. уключаны ў Бярозаўскі раён, а ў 1965 г. адноўлены. Целяханскі раён існаваў да 1959 г., затым уключаны ў склад Івацэвіцкага і Лагішынскага раёнаў. Лагішынскі раён у 1962 г. уключаны ў склад Пінскага, часткова Лунінецкага раёнаў. Потым некаторыя сельсаветы (раней уваходзілі ў склад Целяханскага раёна) перададзены ў Івацэвіцкі раён.

Лінгвагеаграфічнае даследаванне мовы рэгіёна дало магчымасць адасобіць асноўную частку Выганаўскага Палесся (Целяханшчыну) як пэўную дыялектную адзінку. Цэнтральнацеляханскія гаворкі

**© Самуйлик Я.І., 2003**

выступаюць як выразна акрэсленая дыялектная адзінка. Значная частка фанетычных, марфалагічных і лексічных з'яў характэрна гэтаму рэгіёну і мала пашырана або адсутнічае ў рэгіёнах суседніх. Да такіх рыс адносяцца наступныя.

А. У галіне фанетыкі:

1) рэфлекс *о > [ê] ў новых закрытых націскных складах: *в'ѐз, вэ^ы з, стэ^ы л*;

2) галосныя [*ы*], [*і*] на месцы *о ў прыназоўніку *под*: *пыд, п'ід*;

3) вымаўленне губна-губнога зычнага [*w*]: *пра'wда, до'wг'і, куп'і'w*;

4) галосны [*е*] на месцы *ę ў словаформах *гл'едзе'w, зл'ек'awса, зл'ека'цца*;

5) ужыванне пераднаціскнога галоснага [*е*] ў словаформе *йейцэ'м // йейцо'м*;

6) вымаўленне слоў [джала] *жало'*, [часнок] *часны'к*;

7) палаталізаваныя зычныя [*дз*], [*ц*]: *дз'ен', ц'епэ'р* (у адрозненне ад палатальных, пашыраных у гродзенска-баранавіцкіх гаворках);

8) вымаўленна зычнага [*т*] у дзеясловуных формах 3-й асобы адз. і мн. ліку: *хо'дз'іт, хо'д'іт, хо'дз'ат, хо'д'ат*.

Б. У галіне граматыкі (марфалагічныя асаблівасці):

1) канчатак [-э] ў месным склоне адз. ліку назоўніка *мяжа'* (*мэжа'*): *на мэжэ'*;

2) ужыванне канчаткаў [-*эй*], [-*ей*] у назоўнікаў жаночага роду

3) ў родным склоне множнага ліку: *бабэ'й, баб'е'й*;

4) форма меснага склону назоўніка *чо'боты*: *у чобо'тах*;

5) канчаткі [-*е*], [-*і*] ў неазначальнай форме дзеясловаў *пэкц'е'*, *пэкц'і'*;

6) форма 1-й асобы адзіночнага ліку дзеясловаў *ходз'у', ход'у'*;

7) дзеяслоўная форма *в'е'с'ат* у выразе "*часы вісяць*".

В. У галіне лексікі:

Ужыванне лексем: *со'н'ен'ко* (сонейка), *пэрэ'хмарок* (воблака), *красноголо'в'ік* (падасінавік), *овэ'чые грыбы* (неядомыя грыбы), *журахв'і'ны* (журавіны), *чобу'р, чыбу'р* (чабор), *пта'шка* (птушка), *орабу'шок, гарабу'шок* (верабей), *св'і'н'н'е ру'хкают* (свінні рохкаюць), *йе'жык* (вожык), *пыдло'га, помо'ст* (падлога), *ла'пно* (вапна), *звэд* (вага ў калодзежным жураўлі), *звэд* (саха ў калодзежнам жураўлі – іншая семантыка), *комн'ак'і'* (таўчоная бульба – страва), *вуздэ'чка, уздэ'чка* (аброць), *спова'ц'і* (спяваць), *цэ'ха* (палатняная коўдра, радно), *му'с'іт* (мабыць).

Наш рэгіянальны Атлас народных гаворак Выганаўскага Палесся (рукапіс) паказвае наступны малюнак міждыялектных суадносін гаворак гэтай тэрыторыі [4].

1. Выдзяляюцца рысы, якія аб'ядноўваюць увесь ці амаль увесь рэгіён з Панямоннем і супрацьпастаўляюцца Загароддзю: *по'л'е – по'лэ* (карта 25), цвёрды *ц* : мяккі *ц* (карта 38), *у но'с'і : в носу', в но'совы* (карта 57), *л'у'дз'ам : л'у'д'ум* (карта 60), *но'вы : но'вый* (карта 63), *молоды' : молоды'й* (карта 64), *ус'е' : ус'і'* (карта 70), *розка'звац'і : роска'зуваты* (карта 76), *со'н'ейко : со'нычко* (карта 86) і інш.

2. Рысы, якія аб'ядноўваюць з Панямоннем большую частку тэрыторыі Выганаўскага Палесся, акрамя крайняга поўдня (гаворкі валішчанска-аброўскія і інш.): *роб'і'ц'і, роб'і'т'і : роби'ти, робы'ты* (карта 27), *з'іма' : зима', зыма'* (карта 28), *до'вг'і : до'вги, до'вгый* (карта 31), *ц'і'хо, т'і'хо : ти'хо, ты'хо* (карта 33), *на дворэ' : на двор'і'* (карта 55), *кл'у'чка : кл'уч* – вага ў калодзежным жураўлі (карта 118) і інш.

3. Рысы, якія аб'ядноўваюць з Панямоннем большую частку гаворак рэгіёна; з Загароддзем аб'ядноўваюцца асобныя гаворкі, якія тэрытарыяльна ўтвараюць "астравы", "кліны": цвёрды *р* : мяккі *р* (карта 36), цвёрдыя шыпячыя : мяккія шыпячыя (карта 37), *стрыгу'т : стрыжу'т'* (карта 83).

4. Рысы, якія аб'ядноўваюць з Панямоннем паўночную і цэнтральную частку рэгіёна; гаворкі яго паўднёвай часткі аб'ядноўваюцца з Загароддзем: *дз'ен'о'к : дэн'о'к* (карта 24), *дз'ен' : дэн'* (карта 32), *дз'ед : д'ед, д'ід* (карта 34), *жа'ло*: адсутнасць гэтай словаформы – вымаўленне слова "джала" (карта 19).

5. Клінападобны арэал па лініі Івацэвічы – Целяханы, які аб'ядноўваецца з Панямоннем: *слоне'чн'ік : слонэ'чн'ік* (карта 20).

6. Рысы, якія аб'ядноўваюць з Панямоннем паўночную частку рэгіёна; цэнтральная і паўднёвая часткі аб'ядноўваюцца з Загароддзем: *во'с'ен' : о'с'ен', о'сэн'* (карта 43), *во'чы : о'чы* (карта 44), *о'блако* : адсутнасць гэтай словаформы (карта 87), *с'о'н'н'а* : адсутнасць гэтай словаформы (карта 90), *пэту'х : п'е'вэн'* (карта 103), [пра курэй] *соко'чуц' : сокора'т* (карта 105), *гумно' : клу'н'а* (карта 114), *боронова'ц'і : волочы'ц'і* (карта 128).

7. Рысы, якія аб'ядноўваюць Выганаўскае Палессе з Загароддзем і супрацьпастаўляюць яго Панямонню: оканне : аканне (карта 1), *вэн, вôн* і інш.: *ён* (карта 50), *в'е'ц'ор, в'і'т'ор : в'е'ц'ер* (карта 5), *мэд : м'од* (карта 10), *вэ'чор : в'е'чар* (карта 11), *за'йец, за'йец' : за'йац* (карта 15), *був, буў : быў* (карта 18), *бэ'рог : б'е'раг* (карта 22), *до'вгэйе* : іншыя варыянты (карта 26), *дуб : дуп* (карта 39), *мн'а'со : мйа'со* (карта 42), *шчо, шо : што* (карта 52), *бабэ'й : баб, ба'баў* (карта 59), *ходз'і'ц'і, ход'і'т'і, ходы'ты*

*: хадз'і'ц'* (карта 73), *роб'і'ц'іса : раб'і'цца* (карта 74), *л'е'тац', лэ'таты : л'ата'ц'* (карта 77), *чы : ц'і* (карта 85), *по'ночы*: адсутнасць гэтага слова – цёмна (карта 89), *страм'і'на : драб'і'на* – драбіны (карта 113), *клу'н'а : гумно'* (карта 114), *волочы'ц'і : баранава'ц'* (карта 128), *судос'і'ц'іса* : адсутнасць гэтага слова – сустрэцца (карта 129), *чо'боты : бо'ты* (карта 131), *му'с'іт, му'сыт' : ма'быц'* (карта 137).

8. Лакальныя сувязі часткі гаворак Выганаўскага Палесся і Загароддзя: *пролэ'й : пролы'й* – лівень (карта 88), корань "*дзюб*" – дзюба ў птушак (карта 100), *ра'ўкайе : мр'а'вкайе* – кошка мяўкае (карта 108), *пэрэ'чынок : пырэ'чынок* – пластаваны абярэмак сена (карта 120), *цэ'ха : ц'і'ха* – палатняная коўдра (карта 132).

9. Рысы, якія аб'ядноўваюць гаворкі Выганаўскага Палесся, Загароддзя і Тураўшчыны: оканне (карта 1), пратэтычны *в* (карта 50), *в'е'ц'ор, в'і'т'ор* (карта 5) [5: Т.2: К. 40], *за'йец, за'йец'* (карта 15), *був, буў, була'* (карта 18), *шчо* – вымаўленне слова "што" (карта 52), *по'ночы* – цёмна (карта 89), *ц'еп'е'р, ц'епе'р, тэпэ'р* – сёння (карта 90), *волочы'ц'і, волочы'ц', волочы'ты* – баранаваць (карта 128).

10. Рысы, якія аб'ядноўваюць гаворкі Выганаўскага Палесся з гаворкамі Тураўшчыны і не пашыраюцца на асноўную частку Загароддзя: *но'в'е* (карта 23), *молода'* (карта 65), *молодэ', молодэ'йе* (карта 68), *чэбрэ'ц* – чабор (карта 97), *кубло'* – гняздо (карта 99), *ку'ра* – курыца (карта 104), [конь] *нату'рысты* (карта 110), *н'ебо'ж* – пляменнік (карта 135). Дарэчы, па этнаграфічных асаблівасцях частка Выганаўскага Палесся ўваходзіць ва Усходнепалескі рэгіён.

11. Асаблівасці гаворак Выганаўскага Палесся утвараюць значныя арэалы ў палескім дыялектным кантыніуме: *н'е'шчо : н'е'што* – займеннік "нешта" (карта 72), *бойу'са : бойу'с'а* (карта 79), *бу'с'ко* : іншыя назвы – бусел (карта 101), *коп'і'ца : копа'* – капа сена (карта 122).

Вялікая роля ў фарміраванні дыялектнага ландшафту гаворак Выганаўскага Палесся належыць міграцыйным (пераважна мікраміграцыйным) рухам і міждыялектным кантактам. Аснова выдзялення цэнтральнацеляханскіх гаворак, відаць, была закладзена яшчэ да XIII ст. Наяўнасць местачковых цэнтраў у Выганаўскім Палессі спрыяла, па-першае, вылучэнню мікрагруп мясцовых гаворак, па-другое, іх кансалідацыі і захаванню. Наклалі адбітак на дыялектны ландшафт рэгіёна і колішнія дзяржаўныя і адміністрацыйныя межы. Так, сучасная дыялектная мяжа паміж цэнтральнацеляханскай групай паўночнабрэсцкіх гаворак і панямонскімі гаворкамі амаль супадае з былой мяжой Пінскага княства (да пачатку 70-х гадоў XII ст. уваходзіла ў склад Тураўскага княства) з Чорнай Руссю XII-XIII стст., а потым з Літвой часоў Міндоўга.

## СПИСОК ВИКОРИСТАНОЇ ЛІТЕРАТУРИ

1. Дыялекталагічны атлас беларускай мовы. – Мінск: Выд-ва АН БССР, 1963; Лінгвістычная геаграфія і групоўка беларускіх гаворак. Мінск: Навука і тэхніка, 1969; Лексічны атлас беларускіх народных гаворак. У пяці тамах. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993–1998; Лексічныя ландшафты Беларусі. Жывёльны свет. – Мінск: Навука і тэхніка, 1995 (Паўднёва-заходнія ізаглосы).
2. Клімчук Ф.Д. Гаворкі Заходняга Палесся. Фанетычны нарыс. –Мінск: Навука і тэхніка, 1983.
3. Алексеюк М.И. Брест-Литовское воеводство с конца XVI в. до 1772 г. (Карта-схема захоўваецца ў Брэсцкім краязнаўчым музеі).
4. Самуйлік Я.Р. Атлас народных гаворак Выганаўскага Палесся (рукапіс).
5. Атлас української мови. Т. 2. Волинь, Наддністранщина, Закарпаття і суміжні землі. – Київ: Навукова думка, 1988. – Карта № 40.

Матеріал надійшов до редакції 10.12.2003 р.

***Самуйлик Я.И. Говоры Выганайского Полесья в междиалектной среде.***

*В статье рассматриваются вопросы междиалектных связей говоров Выганайского Полесья, а также обосновывается выделение центральнотелеханской группы говоров.*

***Y.I. Samyjlyk. The Dialectual Groups of Vygonoshchi Polesye.***

*The article examines the questions of the connections between different dialectal groups of Vygonoshchi Polesye. It also explains the distinct character of the Central Telekhany dialectal group.*